УДК 372.882

# ЗМЕСТ І ФОРМА МАСТАЦКАГА ТВОРА ЯК СРОДАК ФАРМІРАВАННЯ ЧЫТАЦКАЙ САМАСТОЙНАСЦІ МАЛОДШЫХ ШКОЛЬНІКАЎ

**Н. А. Барысенка**
дацэнт, кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры беларускай і рускай філалогіі
Мазырскага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя І. П. Шамякіна,
г. Мазыр, Рэспубліка Беларусь
E-mail: *nat-1971@tut.by*
**Ж. М. Кухарэнка**
настаўнік, ДУА "Акцябрскі дзіцячы сад – базавая школа Жлобінскага раёна",
в. Акцябр, Жлобінскі раён, Рэспубліка Беларусь
E-mail: *olga-novikova-1989@inbox.ru*

*У артыкуле разглядаюцца магчымасці фарміравання чытацкай самастойнасці малодшых школьнікаў падчас арганізацыі дзейснай працы над зместам і формай мастацкіх твораў. Шматлікія педагагічныя і метадычныя пошукі эфектыўных шляхоў далучэння вучняў пачатковых класаў да мастацтва слова спрабуюць выпрацаваць алгарытм такой працы з мастацкім тэкстам, у ходзе якой можна было б узмацніць яго ўздзеянне на фарміраванне і ўсебаковае развіццё асобы школьніка. Калі мастацкі тэкст будзе асэнсаваны і ўсвядомлены вучнем, то жаданне чытаць самастойна будзе станавіцца ўсё больш моцным, што паспрыяе ўзбагачэнню інтэлектуальна-пазнаваўчага і маральна-эстэтычнага вопыту.*

***Ключавыя словы:*** *чытацкая самастойнасць, чытанне, змест і форма мастацкага твора, малодшы школьнік.*

# CONTENT AND FORM OF THE ARTWORK AS A MEANS OF FORMING THE READER'S INDEPENDENCE OF PRIMARY SCHOOL STUDENTS

**N. A. Borisenko**
associate Professor, Cand.Phil. D., associate Professor Department of Belarusian and Russian Philology of Mozyr State Pedagogical Universitynamed after I. P.Shamyakin,
Mozyr, Republic of Belarus
E-mail: *nat-1971@tut.by*
**G. M. Kukharenko**
pedagogue, SEI "The October kindergarten-basic school Zhlobin district",
D. October, Zhlobin district, Republic of Belarus
E-mail: *olga-novikova-1989@inbox.ru*

*The article considers the possibilities of forming the reader's independence of younger schoolchildren during the organization of effective work on the content and form of works of art. Numerous pedagogical and methodological searches for effective ways to connect primary school students to the art of speech are trying to develop an algorithm for such work with*

МГПУ им. И.П.Шамякина

*a literary text, during which it would be possible to strengthen its impact on the formation and comprehensive development of the student's personality. If the literary text is understood and understood by the student, the desire to read independently will become stronger and stronger, which will contribute to the enrichment of intellectual-cognitive and moral-aesthetic experience.*

***Key words:*** *reader's independence, reading, content and form of a work of art, junior school student.*

**Уводзіны.** Сучаснага школьніка недастаткова проста навучыць чытаць, прымяняючы актуальныя метады, сродкі і прыёмы арганізацыі ўрокаў літаратурнага чытання ў пачатковых класах. Задача настаўніка на першай ступені атрымання сярэдняй адукацыі не з лёгкіх: не толькі развіць, удасканаліць тэхніку чытання, а яшчэ і навучыць выбраць з вялікай плыні, вялізнага патоку інфармацыі тую, якая будзе карысна малодшаму школьніку, зацікавіць яго, выклікае патрэбу ў далейшым пошуку твораў для самастойнага чытання. Поспеху можна дасягнуць, арганізуючы двухбаковы працэс: развіць і ўдасканаліць тэхнічны бок навыку чытання, а таксама праз грунтоўны аналіз зместу і формы мастацкага твора дасягнуць разумення прачытанага.

**Мэта і задачы.** У артыкуле ставіцца мэта вызначыць эфектыўныя метады і прыёмы фарміравання актыўнай чытацкай самастойнасці вучняў пачатковых класаў пры дапамозе арганізацыі работы над зместам і формай мастацкага твора.

**Метады і матэрыял даследавання.** У артыкуле выкарыстаны метад тэарэтычнага аналізу літаратуры (педагагічнай, псіхалагічнай, метадычнай); метад апісання, вывучэння вопыту настаўнікаў, метадыстаў.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Сучасныя педагогі апраўдана занепакоены адсутнасцю ў школьнікаў цікавасці да чытання мастацкіх твораў, як прапануемых школьнай праграмай, так і па-за яе межамі. З цягам часу ўсё цяжэй далучыць дзяцей да працэсу чытання наогул, а тым больш да чытання твораў, рэкамендуемых дарослымі і аднагодкамі, самастойна. Аднак можна заўважыць, што ва ўмовах перавагі тэлебачання, радыё, кіно, інтэрнэта цікавасць да чытання кніг не знікае, таму што толькі кніга можа ўзбагаціць унутраны свет чалавека, даць веды пра жыццё і навакольны свет, развіць самастойнасць мыслення і даць асалоду мастацкага ўспрыняцця прачытанага.

На працягу доўгага часу ў педагогіцы і псіхалогіі вядуцца пошукі эфектыўных шляхоў далучэння малодшых школьнікаў да мастацкага слова, не аднаразова ўзнікае праблема ўзмацнення ўздзеяння мастацкай літаратуры на фарміраванне і ўсебаковае развіццё асобы школьніка. Пры гэтым для поўнага ўсведамлення мастацкай літаратуры малодшаму школьніку неабходны ў першую чаргу эмацыянальны, пачуццёвы вопыт, жыццёвыя ўражанні, якія змогуць забяспечыць мноства асацыяцый пры чытанні мастацкіх твораў, змогуць з'яўляцца апорай для ўзнаўлення мастацкіх вобразаў. Дзіцяці патрэбна гібкасць мыслення, развітасць пачуццяў, уменне суадносіць уражанні, атрыманыя ў жыцці, з тымі, якія ўспрымаюцца ў тэкстах мастацкай літаратуры. Як гэта ажыццявіць, спрачаюцца не адзін год педагогі, псіхолагі, метадысты.

Школьная праграма па літаратурным чытанні ў пачатковых класах пабудавана ў адпаведнасці з усімі патрабаваннямі да развіцця чытацкіх уменняў і навыкаў малодшых школьнікаў, мае на мэце далучэнне іх да лепшых узораў розных літаратурных жанраў, звяртаючы ўвагу на выхаваўчыя здольнасці мастацкіх твораў. І тут важна не толькі навучыць чытаць, навучыць хутка чытаць, а трэба звяртаць увагу на асноўныя заканамернасці і спецыфіку мастацкай літаратуры. Каб мастацкі твор быў асэнсаваны, усвядомлены школьнікам, трэба вучыць дзяцей разумець прачытанае і адрозніваць мастацкі тэкст ад тэкстаў іншых жанраў і тыпаў. Калі такая работа будзе паспяховай, то жаданне чытаць самастойна будзе ўзмацняцца на кожным яе этапе [3; 4].

Заканамерна ўзнікае пытанне, ці зразумелы наогул тэкст мастацкага твора вучням пачатковых класаў? Некаторыя даследчыкі (В. І. Нікіфарава) лічаць, што дзеці на пачатковым этапе навучання не могуць адрозніць навуковае апісанне ад мастацкага. Каб гэта адбылося, трэба вучыць разумець мову мастацкіх твораў. Вядомы рускі пісьменнік, класік літаратуры Ф. М. Дастаеўскі ў сваіх меркаваннях пра тайны мастацкасці гаварыў пра пісьменнікаў, якія адным словам, адной рысай у вобразе могуць выказаць самую сутнасць, каб "самому не рассуждающему читателю стало вдруг все, все понятно" [2, с. 35].

Мастацкі твор, безумоўна, аказвае на кожнага чалавека вялікае ўражанне, а на дзяцей малодшага школьнага ўзросту тым больш. Нават самае непасрэднае ўспрыманне не адбываецца само па сабе. На працягу ўсяго навучання трэба вучыць пранікаць у таямніцы мастацкага твора, і не толькі вучыць, але і раскрываць іх, каб дзіця паступова стала рабіць гэта самастойна. І гэту працу павінен ажыццяўляць не толькі настаўнік пачатковых класаў, яна будзе адбывацца і ў далейшым навучанні і нават на працягу ўсяго жыцця чалавека. Разуменне таямніц мастацкага твора закладзена ў самой яго сістэме. Мастацтва, як і навука, спасцігае жыццё. Але спасціжэнне жыцця ў мастацтве своеасаблівае, дасягаецца пры дапамозе асаблівых, спецыяльных сродкаў. Таму што літаратурнае жыццё – гэта жыццё мастацкіх вобразаў.

Таму пры аналізе і рабоце з тэкстам неабходна зыходзіць з асновы літаратурнага твора. Важна разумець, што выхаванне адбываецца не пры дапамозе пэўных маральных вывадаў з мастацкага твора, а выхоўвае мастацкі вобраз сам па сабе. М. А. Рыбнікава адзначала, што "конечно, можно дать информацию, представление о жадности, дружбе, добре и других человеческих качествах, но эта информация не оставит в душе ребенка ничего, не затронет ни ума, ни сердца ребенка так, как сказка или другое поэтическое произведение, в которых живые сказочные образы героев донесут до ума и сердца ребенка те же мысли, но уже согретые теплом живых картин и образов" [2, с. 38].

МГПУ им. И.П. Шамякина

Вобразнасць у мастацтве не толькі вучыць разумець змест прачытанага, але і ўздзейнічае на псіхічны стан дзіцяці, вучыць дабрыні і сардэчнасці, дазваляе глыбей пранікаць у сэнс. А на гэтым будзе заснавана выхаваўчая мэта кожнага ўрока чытання. М. А. Рыбнікава лічыць, што спачатку адбываецца эмацыянальнае ўспрыманне любога мастацкага твора, а толькі потым можна прыступаць да яго аналізу. І самым важным фактарам успрыняцця мастацкага твора з’яўляецца эмацыянальны, здольнасць чалавека да перажыванняў.

Некаторыя даследчыкі сцвярджаюць, што для поўнага асэнсавання, эмацыянальнага ўспрыняцця недастаткова прачытаць твор адзін раз, яго трэба перачытаць некалькі разоў. Перачытванне тэксту – гэта прыём, у якім спалучаецца работа па паглыбленым разуменні тэксту і развіццю навыка чытання. Калі вучань выказвае свой пункт погляду, адказвае на пытанне па мастацкім творы, то ён шукае пацвярджэнне сваім думкам, сваім разважанням у тэксце мастацкага твора, звяртаецца да яго, каб падмацаваць выказванне вытрымкамі з тэксту.

Малодшаму школьніку даволі цяжка ўсвядоміць і ідэйны змест мастацкага твора, і зразумець мастацкую будову (сюжэт, фабулу, вобразныя сродкі). Літаратуразнаўчыя тэрміны “вобраз”, “ідэя”, “кампазіцыя”, “жанр” у пачатковай школе не вывучаюцца, замест іх выкарыстоўваюцца тэрміны “дзеючая асоба”, “персанаж”, “галоўная думка”, таму што літаратурная адукацыя мае практычны характар, дазваляе дзіцяці назапасіць эмацыянальна-пазнаваўчы і чытацкі вопыт [2, с. 38]. Працуючы з мастацкім творам на ўроках літаратурнага чытання, неабходна ўлічваць усе заканамернасці яго разумення і ўсведамлення. Для гэтага выбіраюцца разнастайныя формы работы: калектыўнае абмеркаванне, каментарый настаўніка, пастаноўка праблемных пытанняў, стварэнне праблемных сітуацый, адказы на пытанні вучняў і г. д. Усе гэтыя формы работы накіраваны на вырашэнне асноўнай задачы – дабіцца паступовага пранікнення вучняў у мастацка-вобразную тканіну твора, паглыблення ў мастацкі свет, створаны пісьменнікам.

Ці ўсё асэнсоўвае школьнік у пачатковых класах, чытаючы мастацкі твор? Перш за ўсё, прадметам асэнсавання становіцца і змест твора, і яго мастацкая форма, гэта значыць не толькі што сказана, але і як сказана. Характары персанажаў, мова твора, сюжэт, кампазіцыя – усё гэта дазваляе глыбей уявіць сабе тэму і ўсвядоміць мастацкі сэнс твора. Але не заўсёды школьнік усё гэта здольны заўважыць, асабліва невялікія дэталі, якія служаць аўтарскай задуме. У мастацкім творы ўсе кампаненты арганічна ўзаемазвязаны, іх нельга падзяліць на часткі або на асобныя кампаненты, а трэба звяртаць увагу, як яны “жывуць” і дзейнічаюць у тканіне мастацкага твора ўсе разам, выконваючы адну мастацкую задачу. Неабходна навучыць дзяцей учытвацца ў мастацкае слова. Працуючы над мастацкім творам, настаўнік не павінен захапляцца толькі завучваннем літаратуразнаўчых паняццяў, выкарыстоўваючы пры гэтым вывучаемы твор у якасці ілюстрацыі.

Як і што зразумелі школьнікі ў мастацкім творы, няцяжка высветліць пры дапамозе пытання “Пра што вы прачыталі?”. Зразумела, што ўспрыняцце прачытанага знаходзіцца ў межах толькі яго сюжэта, у межах прадметнага зместу. Пры пераказе зместу апавядання вучням нескладана будзе ўзнавіць ход дзеянняў, расказаць, што рабілі дзеючыя асобы. Дзеці ўспрымаюць толькі тое, што непасрэдна адбываецца ў тэксце. Напрыклад, у літаратурнай казцы Р. Бензерука “Дружбакі”: *Заяц і Вожык жылі па суседстве, Хмара вырашыла пасварыць сяброў, што рабілі дружбакі ў час дажджу?* і г. д.

На гэтым этапе чытання важна, каб школьнікі ўважліва сачылі за падзеямі, добра разумелі сюжэт. Можна выкарыстоўваць прыём назірання за развіццём падзей. І гэта дапаможа дзецям пранікнуцца павагай да творчасці пісьменніка, праявіць цікавасць да мастацтва расказвання.

Аднак на гэтым нельга спыняць працу над мастацкім творам. Веданне сюжэта прачытанага твора не з’яўляецца асэнсаваннем зместу. Работа над разуменнем характару персанажаў, над матывацыяй іх дзеянняў, над разуменнем унутранага стану герояў праводзіцца на наступным этапе працы над мастацкім творам – калі чытач цікавіцца не толькі ходам падзей, але і ўнутраным станам герояў, матывацыяй іх учынкаў. Тут настаўнік павінен ужо тлумачыць матывацыю дзеянняў герояў, звяртаць увагу, як адлюстроўваецца душэўны стан персанажаў, як развіваюцца ўзаемаадносіны паміж дзеючымі асобамі.

Неабходна вучыць дзяцей параўноўваць, супастаўляць учынкі, характары персанажаў мастацкага твора з аналагічнымі жыццёвымі сітуацыямі або са сваімі асабістымі. Карыснымі будуць заданні прадоўжыць апавяданне самастойна, прыдумаць, што здарылася з героямі потым. Такую работу цяжка праводзіць, калі тэкст прачытаны толькі адзін раз, прачытаць неабходна некалькі разоў. Пры паўторным перачытванні дзеці аналізуюць, аб’ядноўваюць усё, што прачытана, патлумачана настаўнікам, адказана на зададзеныя пытанні, прааналізавана агульнымі намаганнямі. Такі этап працы называецца “асэнсаваны”. Павышаецца цікавасць да прачытанага, вучні ўсё больш паглыбляюцца ў змест мастацкага твора і можна пачынаць выхоўваць цікавасць да самастойнага чытання. На дадзеным этапе навучання вучні часта ўяўляюць сябе на месцы дзеючых персанажаў, адносяцца да іх як да існуючых у рэальнасці. Гэта ўяўленне пра дзеючых персанажаў як пра рэальных асоб праходзіць пасля таго, як школьнікі зразумеюць умоўнасць літаратурных вобразаў. Але ж як сродак пазнання такое атаясамліванне сябе з дзеючымі персанажамі проста неабходна, таму што ўключае ў сябе працэс спачування. На жаль, гэты этап удаецца прайсці далёка не ўсім вучням у пачатковых класах.

МГПУ им. И.П.Шамякина

На гэтым працэс спасціжэння аўтарскай задумкі, асэнсаванне мастацкага тэксту не заканчваецца. Момант спачування, калі ён пройдзены, засвоены вучнем, пераходзіць у наступны этап – асэнсаванне ўнутранага свету дзеючых персанажаў. Тут ужо настаўнік павінен сачыць, каб школьнікі бачылі дзеючага героя не толькі ў працэсе яго ўчынкаў, але і разумелі працэс змен у яго думках, пачуццях, настроі.

Каб дапамагчы дзецям правільна “прайсці па складаных дарогах мастацкага твора”, настаўнік павінен зразумець два накірункі: пра што расказваецца; пра што можна даведацца, прачытаўшы твор. Важна выдзеліць, на што звяртае асноўную ўвагу аўтар, дзеля чаго напісаны мастацкі твор. Ад гэтага ў далейшым будзе залежаць і першаснае ўспрыманне твора, і ход аналізу прачытанага.

Напрыклад, у апавяданні Алены Васілевіч “Калінавая рукавічка” [1, с. 73–78] не проста расказваецца пра каліну, яліну, вавёрку, якая жыла побач з ялінай у цёплым асінавым гняздзе, а пазнаецца нешта большае – узаемаадносіны чалавека і прыроды, адказнасць чалавека за тое, што яго акружае, за ўсё жывое навокал. Гэту ідэю аўтар праводзіць праз мастацкія вобразы твора, якія нясуць галоўную думку, галоўную ідэю, увасабляюць яе і вядуць да ўсведамлення яе чытачамі. Тут важна звярнуць увагу вучняў на тыя вобразныя сродкі, якія выкарыстаў аўтар мастацкага твора. Мова твора, як і мова дзеючых персанажаў, – сродак выражэння таго, што хацеў нам давесці аўтар тэксту, гэта і сродак выражэння адносін аўтара да сваіх герояў. Важна патлумачыць школьнікам, што аўтары мастацкіх твораў, расказваючы пра тую або іншую падзею, працэс, імкнуцца да таго, каб чытачы заўважылі ў дзеючых асобах не толькі іх індывідуальныя рысы, але і нешта агульнае з рысамі таго, хто чытае. І рысы дзеючых персанажаў, сапраўды, могуць быць уласцівы людзям, якія ёсць сярод нас, і нам самім непасрэдна.

Як толькі маленькі чытач пяройдзе ад простага чытання, перачытвання і пераказвання зместу твора да ўсведамлення, асэнсавання прачытанага, можна сказаць, што адбыўся пэўны прагрэс у развіцці асобы малодшага школьніка як чытача [2, с. 37].

Важна звярнуць увагу на адносіны аўтара мастацкага тэксту да дзеючых персанажаў твора і да таго, што акружае як дзеючых асоб, так і да таго, што акружае саміх чытачоў. У славесна-мастацкім творы аўтар выказвае свае думкі і пачуцці праз слова, праз славесны вобраз, а гэта значыць, што слова з’яўляецца сродкам стварэння мастацкага вобраза, таму літаратуру характарызуюць як мастацтва слова. Пры дапамозе слова аўтар стварае свой твор, сваіх герояў, выказвае свае думкі, таму слоўны рад, асаблівасці мовы дзеючых персанажаў не павінны заставацца па-за ўвагай як настаўніка, так і юных чытачоў.

Калі настаўнік будзе ўпэўнены, што ў мастацкім творы важна не толькі тое, што напісана, але і як напісана, з дапамогай якіх сродкаў, і будзе даносіць гэта сцвярджэнне да вучняў, то і малодшыя школьнікі, якія яшчэ толькі пачынаюць уваходзіць у свет мастацкай літаратуры, будуць звяртаць увагу на мастацкую форму твора, якая найбольш важная для мастацкага слова, чым для звычайных зносін паміж людзьмі. Калі настаўнік будзе праводзіць вучняў па шляху паступовага пазнання мастацкага твора, будзе дапамагаць узыходзіць на вяршыню аўтарскага вобразнага ўспрыняцця свету, то зможа значна ўзбагаціць яго інтэлектуальна-пазнавальны і маральна-эстэтычны вопыт. А гэта дазволіць дзіцяці ўдасканаліць сваё развіццё і забяспечыць працэс паўнацэннага вывучэння літаратурных твораў, выклікае жаданне прачытаць яшчэ не адзін мастацкі тэкст самастойна, паспрабаваць прааналізаваць і ўсвядоміць прачытанае.

**Вывады.** Такім чынам, арганізацыя працэсу дасканалага спасціжэння зместу і формы мастацкага тэксту на ўроках літаратурнага і пазакласнага чытання ў пачатковых класах, падчас разнастайных літаратурных мерапрыемстваў дазволіць малодшым школьнікам асэнсавана засвоіць тэматычны і ідэйны змест вывучаемага твора, будзе спрыяць фарміраванню чытацкіх інтарэсаў у самастойным чытанні, вырашаючы адначасова задачы адукацыі, выхавання і развіцця.

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. Варапаева, В. С. Літаратурнае чытанне : падручнік для 3-га кл. агульнаадукац. устаноў з рус. мовай навучання / В. С. Варапаева, Т. С. Куцанава. – Мінск : Маст.літ., 2007. – 128 с.
2. Климанова, Л. Ф. Обучение чтению в начальных классах / Л. Ф.Климанова // Начальная школа, 1999. – № 9. – С. 30–38
3. [Электронный ресурс]. – Режим доступа: www.adu.by / Образовательный процесс. 2019/2020 учебный год / Общее среднее образование / Учебные предметы. I–IV классы. – Дата доступа: 03.04.2019.
4. [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://e-padruchnik.adu.by/.– Дата доступа: 03.04.2019.


**References**


1. Voropaeva, V. S. Literary reading: a textbook for the 3rd class of general education. institutions from the Russian Federation. the language of instruction / V. S. Voropaeva, T. S. Kutsanova. – Minsk : Khud. lit., 2007. – 128 P. (In Bel).
2. Klimanova, L. F. the Teaching of reading in the primary grades / L. F. Klimanova // Elementary school, 1999. – No. 9. – p. 30 – 38. (In Russ).
3. [Electronic resource]. – Access mode: www.adu.by / Educational process. 2019/2020 academic year / General secondary education / Academic subjects. I–IV classes. – Access date: 03.04.2020. (In Russ).
4. [Electronic resource]. – Access mode: http://e-padruchnik.adu.by /. – Access date: 03.04.2020. (In Russ).


МГПУ им. И.П.Шамякина